**Арганізацыя заняткаў па выхаванні ў дзяцей дашкольнага ўзросту цікавасці да беларускай мастацкай літаратуры і фальклору**

**ДРУГАЯ МАЛОДШАЯ ГРУПА**

**( ад 3 да 4 гадоў )**

Дзяцей ад 3 да 4 гадоў з вялікай сілай цягне да рытмізаваных і рыфмаваных радкоў: "рытмічнага гучання вершаў, казак, бадзёрага скандзіравання лічылак і заклічак". Яны с задавальненнем слухаюць невялікія забаўлянкі, заклічкі, вершыкі, песенькі. Дзеці гэтага ўзросту, спасцігаючы невялікія па аб'ёме вершаваныя творы, дакранаюцца да багацця роднай беларускай мовы, набываюць свой першы літаратурны вопыт.

Народная педагогіка цесна злучыла ў адзінае цэлае мастацкае слова і канкрэтныя дзеянні, якія адпавядаюць зместу твора. Расказваць такія малыя шэдэўры вуснай народнай творчасці, як "Сарока-варона», «Ладачкі», «Кую-кую ножку» «Курачка-рабушэчка» немагчыма без выканання пэўных рухаў: згінанне і выпростванне пальцаў, плясканне ў далонькі, пастукванне пальчыкам на назе, качанне.

Некаторыя малыя фальклорныя формы, вершыкі беларускіх пісьменнікаў завучваюцца дзеткамі напамяць. Завучванне вершаў дапамагае выхаванцам адчуць мелодыю гучання мастацкага слова. Тут неабходна асобна адзначыць фактары, якія, на думку А.Г. Жукоўскай, аказваюць уплыў на ўспрыманне вершаваных твораў дзецьмі. Гэта – цікавасць да зместу твора; блізкасць зместа вершаў дзіцячым інтарэсам, індывідуальнаму густу; выразнае чытанне верша дарослымі; сістэматычнасць вершаванага выхавання; авалоданне дзецьмі спосабамі запамінання.

Для дзяцей ад 3 да 4 гадоў падбіраюцца вершы, невялікія па аб'ёме (1 - 2 радкі), блізкія і даступныя па змесце, рытмічныя. Яны, як правіла, абавязкова маюць музычную рыфму, перадаюць вызначанае дзеянне.

У пласт дзіцячага чытання дзяцей гэтага ўзросту таксама ўваходзяць беларускія народныя казкі пра жывёл, якія можна прапаноўваць малым у

розных апрацоўках. Пасля расказвання казкі пажадана ўдакладніць як яна называецца, хто спадабаўся дзеткам ў казцы і чаму. Дарослы можа паведаміць хто ў гэтай казцы спадабаўся ці не спадабаўся менавіта яму і растлумачыць, чаму ён так лічыць. Поспех зносін па змесце мастацкага твора залежыць ад таго, наколькі актыўна дзіця пойдзе на ўзаемны кантакт з дарослым.

Чытаць дзеткам творы беларускіх пісьменнікаў пажадана кожны дзень як ў працэсе нерэгламентаванай мастацка-маўленчай дзейнасці, так і ў час спецыяльна арганізаванага навучання. Асноўнае месца ў актывізуючых зносінах па мастацкім творы займае само чытанне і дыялог, які наладжваецца паміж дзецьмі і педагогам.

Разам з тым у другой малодшай группе пажадана як мага часцей выкарыстоўваць такі прыём, як паўторнае чытанне. Гэта неабходна рабіць дзеля таго, каб ў памяці дзяцей застаўся змест мастацкага твора, а не размова адносна гэтага зместу. Як адзначае В.В. Гербава, менавіта пры паўторным чытанні дзеці с задавальненнем дагаворваюць сказы, імітуюць галасы і паводзіны жывёл.

Для чытання дзеткам ад 3 да 4 гадоў бяруцца кніжкі-малюнкі. Гэта звязана з тым, што для дзяцей гэтага ўзросту характэрна актыўнае ўспрыманне ілюстрацыі. Яны імкнуцца паказаць тыя дзеянні і рухі персанажаў, якія адлюстраваны на малюнку. Малым нават можна прапанаваць паставіць сябе на месца дзеючага персанажа ілюстрацыі. Калі дзіця такім чынам "ўваходзіць" ў змест ілюстрацыі, ён у далейшым з вялікай зацікаўленасцю пачынае распавядаць "аб самім сабе".

У кніжным кутку ў другой малодшай группе пастаянна павінна быць 6-7 кніг. Гэта могуць быць як праграмныя, так і непраграмныя творы.